■ У чаканні прэм'еры

# КОСМАС, РАДЗІВА, КАЗА

## Што мы даведаліся пра будучую пастаноўку па кнізе Андруся Горвата «Радзіва «Прудок»

**Тое, што Купалаўскі тэатр плануе паставіць спектакль па кнізе Андруся Горвата «Радзіва «Прудок» — даўно не навіна. Але ў мінулую пятніцу купалаўцы запрасілі ў сваю малую залу самога аўтара бестселера, генеральнага партнёра пастаноўкі — кампанію velcom і паспрабавалі праз адсылкі да космасу расказаць журналістам, што гэта будзе. У выніку аказалася, што і рэжысёр — Раман Падаляка — і ўсе тры акцёры, якія будуць удзельнічаць у праекце, дакладна нічога не ведаюць, бо намацванне спосабу ўвасобіць на сцэне нашумелую кнігу яшчэ ў працэсе, а «калі ты нешта ведаеш упачатку, гэта часцей за ўсё памылкова». Так ці інакш, прэм'ера павінна адбыцца 16 мая, і ў будучых гледачоў ёсць час прачытаць альбо перачытаць «Радзіва «Прудок».**



Мікрафон у Андруся ГОРВАТА.

Не ведаю, наколькі гэта інфармацыя важная, але прынамсі займальная: пару гадоў таму Андрусь Горват, які праславіўся тым, што з'ехаў са сталіцы ў вёску Прудок, завёў казу, пачаў публікаваць кароткія тэксты пра вясковыя «кур'ёзы» ў «Фэйсбуку», а ў выніку напісаў папулярную кнігу «Радзіва «Прудок» — дык вось, пару гадоў таму ён працаваў дворнікам у Купалаўскім тэатры.

Праз нейкі час, а дакладней 23 сакавіка, ён сядзіць у малой зале тэатра перад натоўпам журналістаў як аўтар бестселера, па якім ставіцца спектакль, і кажа, што ўсё гэта не падаецца яму праўдай. «Я дагэтуль больш адчуваю сябе дворнікам Купалаўскага тэатра. У мяне такое адчуванне, што я сюды прыходжу, а ў мяне тут нейкі юбілей — усе так радасна сустракаюць, нейкія важныя падзеі адбываюцца...»

Будучая пастаноўка, дзе Андрусь Горват — галоўны канструктар, Раман Падаляка — той, хто вызначае дырэкторыю палётаў, а акцёры — касманаўты, адбудзецца пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі. Яе месцам стане тая ж малая зала Купалаўскага, а сыграюць герояў кнігі «Радзіва «Прудок» тры выканаўцы — Святлана Анікей, Дзмітрый Есяневіч і Міхаіл Зуй, які стане ўласна сцэнічным увасабленнем самога аўтара кнігі. Касманаўтам, альбо, як іх прадставіў Раман Падаляка, «адным з найлепшых акцёраў галактыкі», прыйдзецца выконваць у спектаклі адразу некалькі роляў.



Міхаіл ЗУЙ.

«На пэўны час эксперыментальная сцэна Купалаўскага тэатра ператворыцца ў цэнтр кіравання палётамі, бо мы запланавалі вельмі рызыкоўнае, але цікавае падарожжа на планету Прудок. Калі ўсё будзе добра, спадзяёмся, мы паспяхова прызямлімся там 16-17 мая, адчуем гравітацыю і зямлю пад нагамі».

Цікава, што «Радзіва «Прудок» ужо не першы раз фігуруе ў праектах кампаніі velcom. У першую чаргу яно было названа адной з чатырох самых цікавых кніг для публікі ў праекце MOVABOX. А потым у фестывалі мабільнага кіно Smartfilm Прыз глядацкіх сімпатый атрымаў вельмі займальны, крыху тэатральны ролік «Ягор», пастаўлены па адным з эпізодаў «Радзіва». Рэжысёрам яго, дарэчы, быў Раман Падаляка, а акцёрамі — купалаўцы. Сам Андрусь Горват, па яго словах, паглядзеў «Ягора» разоў семдзесят.

«Гэта вельмі крутая работа, я першы раз не паверыў проста, потым добра прыглядзеўся... Ну, я ў неверагодным захапленні ад таго, што купалаўцы адчулі тое, што нават я, можа быць, не да канца зразумеў. У мяне быў, па сутнасці, такі чарнавік, а яны неяк глыбей капнулі і паказалі тое, чаго я ў сваім тэксце не бачыў. Яны ніяк яго не сапсавалі, не ўнеслі ніякіх супярэчнасцяў, сябе туды дадалі, гэта ўвогуле крута».

Такое меркаванне «галоўнага канструктара» якраз пацвярджае словы Рамана Падалякі пра тое, што аўтары пастаноўкі з аўтарам кнігі знаходзяцца на адной касмічнай хвалі, калі першыя разумеюць, што хацеў сказаць другі. «Андрусь даў нам нейкі карт-бланш для таго, каб рабіць усё так, як нам здаецца патрэбным, каб мы нават мянялі тое, што ёсць у кнізе, месцамі, перастаўлялі і так і сяк...»

Таму, не ведаючы амаль нічога дакладнага пра будучы спектакль, але будучы заінтрыгаванай планетай Прудок, узаемапаразуменнем аўтараў і смешным мабільным фільмам «Ягор», публіка чакае прэм'еры. Урэшце, гэта сапраўды цікава: як даволі спецыфічная структура папулярнай кнігі ўвасобіцца ў тэатральнай форме.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Запрашальнік

# Што абуджае вясна?

**У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, што па вуліцы Някрасава, 3, распачала сваю работу выстаўка «Вясна, кветкі і пацалункі, або Вясновая ліхаманка», на якой прадстаўлены работы з музейнай калекцыі цэнтра.**


Карціна Ганны СІЛІВОНЧЫК.

Вясновая ліхаманка ахоплівае заўсёды нечакана, незалежна ад нашай волі, паступова падбіраючыся ў канцы лютага, а з пачаткам каляндарнай вясны выклікае ўстойлівы, вельмі адчувальны неспакой. З усёй жа настойлівасцю ліхаманка апаноўвае нас бліжэй да сярэдзіны красавіка, калі «гракі прыляцелі» і сонца выдатна і нямоўлна раскідвае свае прамяні, абуджаючы невытлумачальныя пачуцці і нявыказаныя жаданні.

Дык чаго ж мы чакаем ад вясны? Чым яна так прыцягальная? І без чаго вясна немагчымая? Гэту пару цяжка сабе ўявіць без кветак — пачынаючы з васьмісакавіцкіх мімоз і цюльпанаў, што сціпла выглядваюць з кардонных скрынак у падземных пераходах. Па меры абуджэння прыроды да іх далучаюцца пралескі, ландышы, крокусы, бэз. Апошняя кветка — улюбёны матыў многіх беларускіх мастакоў. Яе не раз малявалі Барыс Аракчэеў, Леанід Шчамялёў, Віталь Цвірко, Святлана Каткова, Ігар Бархаткоў, з маладых — Васіль Пяшкун і іншыя жывапісцы, верныя эстэтычнай пазіцыі рэалізму.

Адзін з удзельнікаў выстаўкі, Уладзімір Зінкевіч, так акрэсліў сваё адчуванне вясны:

— Поры года і межы жанраў змяняюцца. Але кожны раз, беручы ў рукі чыстае белае палатно, ты поўны надзеяў стварыць нешта дзівоснае, новае і значнае. Так і вясна — яна дае свежыя эмоцыі. Мы разлічваем на пачатак новага шляху, які прывядзе нас да поспеху, шчасця... і чагосьці нечаканага.

Пагадзіцеся, вясну складана ўявіць без рамантычных пачуццяў, спатканняў і пацалункаў. Менавіта гэтай парой здараюцца самыя яркія і незабыўныя сустрэчы, адраджаюцца трохі пазабываныя пачуцці да знаёмага, блізкага чалавека. Каму, як не мастаку, гэтаксама як і паэту, музыканту, рэжысёру, харэографу, выразнымі сродкамі мастацтва дадзена перадаць невымоўнае? Прадстаўленыя на выстаўцы аўтары, сярод якіх Васіль Касцючэнка, Уладзімір Кожух, Аляксандр Ксяндзоў, Руслан Вашкевіч, Антаніна Слабодчыкава, Ганна Сілівончык, у сваёй творчасці даследуюць такую крыху эфемерную сферу.

— У гэты чароўны час натхнення і надзей, калі ў прыродзе ўсё буяе, актыўна відазмяняецца, пачынае размнажацца і пладзіцца, чалавек таксама адчувае прыліў сіл, энергіі і выбух пачуццяў, — разважае мастачка Ганна Сілівончык. — Здаецца, што табе ўсё пад сілу і ты можаш змяніць і сябе, і ўвесь свет, перавярнуць горы, выпіць мора, дацягнуцца да зорак. Але потым раптам надыходзіць лета і ўвесь энтузіязм паглынае блажэнная ленасць і пяшчота гарачых дзён. За імі прыходзяць восеньская туга і зімовая спячка. І ты разумееш, што зноў нічога не паспеў і не ўчыніў. Але варта падзьмуць вясноваму ветру — і ўсё паўтараецца. Чалавек ізноў акрылены і ўзбуджаны, поўны самых смелых мар і грандыёзных планаў. Вось такі вечны кругазварот.

Вясну можна любіць ці не любіць, але яна наўрад ці каго-небудзь пакідае абыякавым. І зноў з году ў год мы яе чакаем — з надзеяй, прадчуваннем шчасця, чаканнем нечага цудоўнага і фантастычнага.

— Якой бы доўгай, халоднай ці цёплай, белай ці не вельмі ні была зіма, надыходзіць момант, калі ў паветры з'яўляецца няўлоўны пах, — заўважае мастачка Тацццяна Грыневіч. — Пах надзеі, пах свежасці і прыгажосці, пах кахання, пах нейкай няўмольнай прыроднай сілы — гэта пах вясны. Менавіта ў гэты час для мяне пачынаецца вясна. Магія гэтага паху распаўсюджваецца скрозь. Судакрануўшыся з маім сэрцам, ён усяляе глыбокую ўпэўненасць у тым, што цуд існуе, а мары спраўджваюцца.

Выстаўка будзе працаваць да 21 красавіка. Варта завітаць, калі вы яшчэ не адчуваеце вясну, калі хочаце адкрыць для сябе па-новаму гэты час і, вядома ж, убачыць яго самыя яркія фарбы на палотнах мастакоў.

**Варвара ГОМАН**